Нет № 1—34



## Сталіца Совецкай Малдавіі



Аднаўленчыя работы ў Кішынёўскім чыгуначным дэпо, варварскі разбураным нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Фотахроніка ТАСС.

## Абавязацельствы перавыканалі

У адказ на поспехі Чырвонай Арміі, якая ачысціла нашу краіну ад фашысцкіх разбойнікаў, калгаснікі нашай вобласці абавязаліся здаць у фонд Чырвонай Арміі 210 тысяч пудоў зярна зверх абавязковых паставак.

Словы свае калгаснікі стрымалі. Па вобласці ў фонд Чырвонай Арміі яны здалі 235860 пудоў высокаякаснага збожжа.

Лепшыя ўзоры па здачы хлеба нашай вызваліцельніцы паказалі калгаснікі Цераховускага раёна, якія здалі 471 тону, Рэчыцкага -443 тоны, Свяцілавіцкага-381 тону.

Здача хлеба ў фонд Чырвонай Арміі працягваецца.

## Даклад таварыша Сталіна вывучаецца ў калгасах

У 12 калгасных гуртках Гомельскага сельскага раёна пачалося сістэматычнае вывучэнне даклада таварыша Сталіна, які быў зроблен 6 лістапада 1944 года на ўрачыстым паседжанні ў Маскве.

У Бабовічах калгасным гуртком кіруе старшыня сельсовета тав. Рудэнка. У Пакалюбіцкім сельсовеце знаёміць з дакладам загадчык хаты-чытальні тав. Клімовіч. У Мільчы гуртком кіруе агітатар тав. Мукніс.

У калгасах „Авангард“, „Чырвоная воля“, „Чырвонагвардзеец“ ужо адбыліся чыткі даклада таварыша Сталіна. У раённым цэнтры склікаецца нарада агітатараў і загадчыкаў хат-чытален, дзе будзе зроблен інструктаж па дакладу таварыша Сталіна.

# Аб партыйнай дысцыпліне

**Г. БАВАРСКІ**

Вялікая Айчынная вайна паказала несакрушальную моц совецкай дзяржавы і неразрыўнае адзінства народаў нашай краіны. Совецкі Саюз не толькі ўстаяў перад напорам гіганцкай ваеннай машыны праціўніка, але і нанёс гітлераўскай Германіі смяротны ўдар.

Кіруючай і накіроўваючай сілай Совецкай дзяржавы з'яўляецца партыя Леніна—Сталіна. Бальшэвіцкая партыя натхніла і арганізавала народныя масы на барацьбу супроць нямецкіх захопнікаў, сабрала ў адно намаганні совецкіх людзей і накіравала на разгром ворага. Яна змагла гэта зрабіць таму, што ні адна партыя ў свеце не карыстаецца такім аўтарытэтам і глыбокай павагай у народных масах, як наша бальшэвіцкая партыя.

Якія-ж якасці забяспечылі ёй усенароднае прызнанне і беззаветную падтрымку? Ленін яшчэ ў 1920 годзе ўказваў, што Совецкая ўлада не перамагла-б і не пратрымалася-б і двух месяцаў без строжайшай, сапраўды жалезнай дысцыпліны ў нашай партыі. Бальшэвіцкая дысцыпліна, яе суровыя законы абумовілі высокі ўзровень дзяржаўнай і вытворчай дысцыпліны ў краіне, забяспечылі поспехі соцыялістычнага будаўніцтва, перамогу сталінскіх пяцігодак ва ўсіх галінах гаспадаркі і культуры

У сваёй выдатнай рабоце „Дзіцячая хвароба „левізны“ ў комунізме“ Ленін гаварыў, што партыйная дысцыпліна трымаецца і правяраецца, „папершае, свядомасцю пролетарскага авангарда і яго адданасцю рэволюцыі, яго вытрыманасцю, самаахвяраваннем, гераізмам. Па-другое, яго ўменнем звязацца, зблізіцца, да вядомай ступені, калі хочаце, зліцца з самай шырокай масай працоўных, у першую галаву-, пролетарскай, але таксама і з непролетарскай працоўнай масай. Па-трэцяе, правільнасцю палітычнага кіраўніцтва, ажыццяўляемага гэтым авангардам, правільнасцю яго палітычнай стратэгіі і тактыкі, пры ўмове, каб самыя шырокія масы ўласным вопытам пераканаліся ў гэтай правільнасці“.

На працягу многіх год гераічнай барацьбы бальшэвікі паказалі, што, апіраючыся на перадавую рэволюцыйную тэорыю, ведаючы законы грамадскага развіцця, яны ўмеюць у самых цяжкіх і складаных умовах весці народ да вызначанай мэты. На XVII з'ездзе партыі таварыш Сталін гаварыў: «Толькі наша партыя ведае, куды весці справу, і вядзе яе ўперад з поспехам. Чаму абавязана наша партыя гэтай сваёй перавагай? Таму, што яна з'яўляецца партыяй марксісцкай, партыяй ленінскай. Яна абавязана таму, што кіруецца ў сваёй рабоце вучэннем Маркса, Энгельса, Леніна. Не можа быць сумнення, што пакуль мы застаемся вернымі гэтаму вучэнню, пакуль мы валодаем гэтым компасам, — будзем мець поспех у сваёй рабоце“.

Паспяховае выкананне пастаўленых партыяй задач магчыма толькі пры ўмове, калі кожны комуніст будзе свядома змагацца за іх ажыццяўленне. Пагэтаму партыя ўмяняе ў абавязак усім сваім членам „нястомна работаць над павышэннем сваёй свядомасці, над засваеннем асноў марксізма-ленінізма“. (Статут ВКП(б)). Строжайшая партыйная дысцыпліна падмацоўваецца тым, што ў бальшэвікоў няма разрыву паміж тэорыяй і практыкай. Арганізацыйная работа партыі заўсёды нацэлена на тое, каб усе комуністы былі згуртаваны для пераўтварэння ў жыццё яе рашэнняў. Калі не будзе адзінства волі і дзеянняў, то ў любой партыйнай арганізацыі самыя правільныя рашэнні могуць ператварыцца ў пустую паперку.

Магутнасць нашай партыі — у яе неразрыўных сувязях з народнымі масамі, ва ўменні давесці да свядомасці мас правільнасць партыйных рашэнняў і мабілізаваць усіх працоўных на выкананне гэтых рашэнняў. Партыя адбірае ў свае рады цвет нашага народа—лепшых людзей рабочага класа, калгаснага сялянства і інтэлігенцыі. Згуртаванне беспартыйных вакол сцягу Леніна—Сталіна — абавязак кожнага комуніста, адно з важнейшых патрабаванняў партыйнай дысцыпліны.

Устанаўленне цяснейшых сувязей з масамі, уменне весці іх наперад дасягаецца не толькі праўдзівай палітычнай агітацыяй і прапагандай, але і настойлівай барацьбой за ажыццяўленне высунутых лозунгаў, прыкладам самаадданай работы саміх комуністаў, іх асабістай мужнасцю і адвагай.

На фронце, калі воінская часць павінна штурмам узяць умацаваную паласу праціўніка, у перадавыя ланцугі байцоў, ад рашымасці і адвагі якіх залежыць поспех аперацыі, звычайна становяцца самыя смелыя і, у першую чаргу, — комуністы.

(Працяг будзе).

## ...ая інфармацыя

### Ваенныя дзеянні ў Заходняй Еўропе

ЛОНДАН, 16 лістапада. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца:

Войскі саюзнікаў працягвалі наступленне ў раёне Веерта (Галандыя) і прасунуліся наперад на 7 тысяч ярдаў.

У раёне Эншвейлер-Ландорф (Латарынгія) адбіты контратакі праціўніка. Войскі саюзнікаў знаходзяцца ў Маркінгене, Варанвейлеры, Геблінгу і дасягнулі раёна Марсала.

На паўночны ўсход ад Бакара пасля цяжкіх баёў вызвален Сэнт-Поль.

Сталы націск на праціўніка вымушае немцаў павольна адступаць на паўднёвы ўсход ад Бруйера.

У раёне Бельфора войскі саюзнікаў прасунуліся на некалькі міль у даліне ракі Ду.

Цяжкія бамбардыроўшчыкі ў суправаджэнні знішчальнікаў зрабілі налёт на завод сінтэтычнага гаручага ў Дортмундзе. Увечары 15 лістапада лёгкія бамбардыроўшчыкі зрабілі налёт на Берлін.

ЛОНДАН, 16 лістапада. (ТАСС). У паведамленні штаба ўзброеных сіл саюзнікаў на міжземнаморскім тэатры ваенных дзеянняў гаворыцца, што ў Італіі часці 8-ай арміі працягваюць прасоўвацца на поўнач і на захад ад Форлі. На поўнач ад Форлі перадавыя калоны саюзнікаў на шырокім фронце выйшлі да ракі Монтоне. На захад ад Форлі саюзнікамі заняты Цэтрыньоне. Шасе Флярэнцыя—Форлі цалкам знаходзіцца ў руках саюзнікаў. У сектары 5-ай арміі працягваліся актыўныя дзеянні патруляў.

14 лістапада невялікія часці саюзнікаў высадзіліся на востраве Мелос (Эгейскае мора). Праціўніку былі нанесены страты, узяты палонныя.

У сувязі з дрэнным надвор'ем 15 лістапада вялікая частка аперацый паветраных сіл саюзнікаў была адменена.

### Баі ў Югаславіі

БЕЛГРАД, 16 лістапада. (ТАСС). Вярхоўны штаб Народна-Вызваленчай арміі паведамляе, што ў Чарнагорыі часці Народна-Вызваленчай арміі працягваюць праследваць адступаючага ад Цэціне да Падгорыцэ нямецкія войскі. Адступаючыя з Албаніі нямецкія часці працягваюць канцэнтравацца ў раёне Падгорыца—Дані—Лоуград.

У Герцагавіне перайшоўшыя ў контрнаступленне югаслаўскія часці занялі Шунцу і пацяснілі праціўніка ў Дубно.

У Далмацыі працягваюцца жорсткія баі ў раёне Кніна.

У Харваціі на дарозе Загрэб—Белавар разбіта буйная Усташская калона.

### Расстрэл у Берліне гвалтоўна ўвезеных савецкіх рабочых

СТАКГОЛЬМ, 16 лістапада. (ТАСС). Газета „Афтанбладэт“ паведамляе, што ў Берліне расстраляны 9 савецкіх грамадзян, якіх немцы абвінавацілі ў забойстве паліцэйскіх.

### Бельгійскія міністры комуністы пада... ў адстаўку

ЛОНДАН, 17 лістапада (ТАСС). Брусельскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе, што два бельгійскія міністры комуністы Альберт Марто (міністр аховы здароўя) і Дыспі (міністр без партфеля) падалі ўчора ў адстаўку. Зрабіў заяву аб адстаўцы таксама міністр без партфеля Дэмоні.

На 1 курс музычнага вучылішча прынята многа моладзі з раёнаў вобласці, ... заняткі з навучаючыміся. Праз некаторы час пачнуцца заняткі ў класах.

... цяпер, калі Францыя вызвалена, каб яна магла як мага паўней удзельнічаць у агульнай барацьбе. Пры абмеркаванні ўсіх палітычных пытанняў французскія і брытанскія міністры былі аднолькава шчаслівы адзначыць поўнае адзінства поглядаў, адпавядаючых салідарнасці іх інтарэсаў, і цеплыню пачуццяў, якая знайшла свой выраз у прамовах, якімі абмяняліся генерал дэ-Голь і брытанскія міністры“.

## Мастацкія работы школьнікаў

Набліжаючуюся гадавіну з дня вызвалення Гомеля школьнікі сустракаюць узмоцненай падрыхтоўкай. Рыхтуецца выстаўка на тэму: „Рост нашых школ“.

Дыяграмы, мастацкія работы, малюнкі і іншыя экспанаты выстаўкі яскрава раскажуць аб тым, як па-баявому сваімі сіламі настаўнікі і вучні аднаўлялі школы, як наладжана ў школах работа комсамольскіх і піонерскіх арганізацый.

У кожнай школе будуць праведзены вечары, гутаркі і выпушчаны спецыяльныя нумары насценных газет, прысвечаныя гадавіне вызвалення.

## Крылоўскія ранішнікі ў школах

Вучні гомельскіх школ рыхтуюцца да стагоддзя з дня смерці І. А. Крылова. Ва ўсіх школах горада вылучаны спецыяльныя крылоўскія камісіі па арганізацыі і правядзенню ранішнікаў.

Выкладчыца школы № 7 тав. Бабіна рыхтуе даклад аб жыцці і творчасці вялікага байкапісца, а вучні гэтай школы падрыхтавалі мастацкую праграму і выстаўку з адлюстраваннем вобразаў з твораў пісьменніка. Выдатна афармілі яны рукадзельнае пано па байцы Крылова „Квартэт“. Вучні 5 школы падрыхтавалі да крылоўскага вечара цікавую выстаўку, мастацка-літаратурныя альбомы.

### Спроба паўстання ў Мюнхене

СТАКГОЛЬМ, 16 лістапада. (ТАСС). Газета „Афтанбладэт“ перадае паведамленне швейцарскай газеты „Арбейтэр цэйтунг“ аб тым, што ў Мюнхене месяц спроба паўстання, у выніку чаго Гімлер прыняў асобыя меры перасцярогі. За апошні час гестапаўцамі было арыштавана каля 70 тысяч чалавек.

В. а. адказнага рэдактара А. П. УС.

ГОМЕЛЬСКАЙ АБЛКАНТОРЫ
дзяржгатункфонда
патрабуюцца ў апарат старшы бухгалтар і бухгалтар на сталую работу або па сумяшчэнню.
З прапановамі звяртацца: Гомель, Пролетарская 8.
Кіраўніцтва аблканторы.

Друкарня „Палесдрук“. Е01002 Адрас рэдакцыі: Гомель, Веткаўская, 25. Тэл. 0-89.